ІНСТЫТУТ ПАЛІТЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ
ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА

Palitsfera Working Papers No. 10/2026

БЕЛАРУСКАЯ НАВУКА ПАД ЦІСКАМ

Трансфармацыя даследчага сектара Беларусі пасля 2020 года

Palitsfera Working Papers No. 10/2026

Беларуская навука пад ціскам

Трансфармацыя даследчага сектара Беларусі пасля 2020 года

Андрэй Казакевіч, PhD у галіне палітычных навук

Інстытут палітычных даследаванняў «Палітычная сфера»

Важным наступствам задушэння дэмакратычных пратэстаў 2020 года і падтрымкі беларускімі ўладамі расійскай агрэсіі супраць Украіны стала глыбокая трансфармацыя акадэмічнага асяроддзя Беларусі. Сотні навукоўцаў і выкладчыкаў зазналі рэпрэсіі, дзясяткі былі пазбаўлены волі. Сотні вымушана пакінулі краіну, а, магчыма, да тысячы чалавек страцілі магчымасць працягваць звыклую прафесійную дзейнасць.

Акрамя таго, універсітэтам і даследчым цэнтрам быў навязаны непасрэдны ідэалагічны кантроль, які прадугледжвае сістэматычную прапаганду аўтарытарнай сістэмы і рэпрэсій, а таксама распаўсюджванне расійскіх палітычных наратываў. Пры гэтым многія тэмы і кірункі даследаванняў фактычна зніклі або сталі маргіналізаванымі. Асновай новай ідэалогіі сталі антыеўрапейскія і антызаходнія наратывы, культ аўтарытарнай улады А. Лукашэнкі, непрыманне дэмакратыі і апраўданне таталітарнай савецкай мінуўшчыны. Улады ўдзяляюць асаблівую ўвагу ўмацаванню савецкай ідэнтычнасці і прадстаўленню савецкіх дасягненняў як ідэалу, вартага пераймання.

У гэтых умовах падтрымка ЕС, скіраваная на захаванне і развіццё беларускай акадэмічнай супольнасці і даследаванняў Беларусі, мае крытычна важнае значэнне для беларускага грамадства. Яна дазволіць развіваць дэмакратычную і еўрапейскую альтэрнатыву яго развіцця і змяншаць разбуральны ўплыў аўтарытарных і расійскіх імперскіх наратываў.

Развіццё дэмакратычнай і еўрапейскай альтэрнатывы пашырае магчымасці супрацьдзеяння дэзынфармацыі і радыкальным антыеўрапейскім ідэям, а таксама павышае шанцы на фарміраванне ў будучыні стабільнай і дружалюбнай беларускай дзяржавы, звязанай з ЕС адносінамі супрацоўніцтва і партнёрства.

Акрамя таго, сістэматычныя веды пра Беларусь важныя для фарміравання эфектыўнай замежнай палітыкі і палітыкі бяспекі ЕС ва Усходняй Еўропе, паколькі ствараюць умовы для больш дакладнай ацэнкі развіцця падзей і, адпаведна, для прыняцця абгрунтаваных рашэнняў.

Варта адзначыць, што цяпер сістэмныя даследаванні Беларусі ў ЕС і ЗША, паводле ацэнкі аўтара, практычна не праводзяцца, а кола спецыялістаў надзвычай вузкае і не перавышае дзесяці чалавек, большасць з якіх займаюцца таксама сумежнымі галінамі.

Еўрапейскі саюз павінен стаць лідарам у даследаваннях Беларусі і ўнікальнай прасторай назапашвання ведаў пра краіну, не падкантрольных аўтарытарнай уладзе і расійскім імперскім наратывам.

У межах гэтага аналізу мы дамо кароткую характарыстыку стану даследчага поля Беларусі, асноўных тэндэнцый ідэалагізацыі, мілітарызацыі і ўзмацнення расійскага ўплыву, практык рэпрэсій, а таксама прадставім рэкамендацыі для палітыкі ЕС у галіне захавання беларускай акадэмічнай супольнасці і ведаў пра Беларусь.

Агульныя характарыстыкі даследчага поля

Беларускі даследчы сектар, асабліва ў сферы гуманітарных і сацыяльных навук, з самага пачатку постсавецкага перыяду сутыкаўся з істотнымі абмежаваннямі развіцця. Палітычны крызіс 2020 года і пачатак вайны ў 2022 годзе прывялі да далейшага разбурэння даследчай супольнасці, ужо


аслабленай шматгадовым аўтарытарным кіраваннем. Для яе былі характэрны хранічнае недафінансаванне, традыцыйная ізаляванасць, ідэалагічны кантроль з боку дзяржавы і навязванне прарасійскіх наратываў.

Для беларускіх уладаў даследаванні ў сацыяльнай і гуманітарнай сферах — перадусім пытанне ідэалогіі. З сярэдзіны 1990-х гадоў працягвалася ўзнаўленне многіх савецкіх практык палітычнага кантролю над універсітэтамі і даследаваннямі. Многія адчувальныя тэмы (асабліва ў галіне гісторыі і палітыкі), як і даследчыкі, якія праявілі нелаяльнасць да ўлады, былі выцеснены з дзяржаўных устаноў. Гэтыя даследаванні працягваліся або ў арганізацыях грамадзянскай супольнасці, або за межамі краіны. Пасля палітычнага крызісу 2020 года большасць структур грамадзянскай супольнасці, у тым ліку тых, што займаліся даследаваннямі, былі знішчаны, а палітычны і ідэалагічны кантроль над акадэмічнай сферай яшчэ больш узмацніўся.

Стан і асноўныя тэндэнцыі развіцця даследчага сектара Беларусі

Выдаткі на даследаванні

Агульны стан даследчага сектара Беларусі застаецца цяжкім. Беларусь значна адстае ад развітых краін у долі выдаткаў на навуку ў ВУП. Калі ў ЕС і ЗША гэты паказчык складае 2–3%, у Польшчы і Літве каля 1–1,5%, а ў Расіі каля 1%, то ў Беларусі па выніках 2024 года — толькі каля 0,59%. Гэта значна менш, чым у савецкі час, калі выдаткі на навуку дасягалі 2% ВУП. Важна адзначыць, што ўзровень выдаткаў істотна ніжэйшы за планавыя паказчыкі. Згодна з планамі ўладаў у 2000-х і 2010-х гадах, выдаткі на даследаванні павінны былі дасягнуць 2–3% ВУП. Паводле Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021–2025 гады — як мінімум 1%. Аднак гэтыя планы не былі рэалізаваны, і апошнія 15 гадоў у сектары назіраецца працяглы спад, які перарываецца толькі кароткачасовымі паляпшэннямі.



Іл. 1. Доля выдаткаў на даследаванні ў ВУП Беларусі, 2000–2024 гады

Колькасць занятых у сектары

Неспрыяльная сітуацыя складваецца і з колькасцю занятых у даследчай сферы, якая няўхільна скарачалася апошнія 10–15 гадоў. Пэўны рост назіраецца толькі з 2023 года, што, магчыма, у


значнай ступені звязана з інвестыцыямі ў абаронны сектар пасля пачатку вайны Расіі супраць Украіны. У любым выпадку гэтага недастаткова для кампенсацыі страт апошняга дзесяцігоддзя. Усяго ў Беларусі 17,7 тыс. даследчыкаў (head count), што менш, чым у Фінляндыі.

Сацыяльныя і гуманітарныя навукі

Сектар сацыяльных і гуманітарных навук яшчэ меншы. Колькасць занятых у гуманітарных даследаваннях (head count) складае каля 600 чалавек, у сацыяльных навуках — 1,1 тыс. чалавек. Выдаткі на даследаванні ў галіне гуманітарных навук складаюць усяго каля 5 млн еўра за год, а ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук разам — каля 16 млн еўра за год.

Колькасць навуковых кніг

Агульны крызіс даследчага сектара суправаджаецца значным скарачэннем аб'ёму навуковай прадукцыі. У прыватнасці, за апошняе дзесяцігоддзе колькасць выдадзеных навуковых кніг скарацілася на 30% і паводле вынікаў 2023 года склала 972 супраць 1360 у 2012 годзе. Упершыню паказчык апусціўся ніжэй за 1 тыс. у 2020 годзе, калі пачаўся палітычны крызіс.



Іл. 2. Колькасць навуковых кніг, выдадзеных у Беларусі, 2012–2023 гады

Колькасць дысертацый

Падобная сітуацыя назіраецца з колькасцю апублікаваных дысертацый, што таксама адлюстроўвае спад у сектары і пагаршэнне палітычнага клімату пасля 2020 года. За апошняе дзесяцігоддзе колькасць апублікаваных дысертацый скарацілася амаль на 40%: з 574 у 2013 годзе да 362 у 2023 годзе. Найбольш рэзкае падзенне прыпала на 2020–2021 гады, калі гэты паказчык упершыню апусціўся ніжэй за 400.

Колькасць дысертацый таксама дазваляе ацаніць памеры прафесійных супольнасцяў у асобных дысцыплінах. У сацыялогіі ў сярэднім абараняецца каля сямі дысертацый за год, у палітычных навуках каля пяці, у філасофіі — каля чатырох, чаго недастаткова для эфектыўнага ўзнаўлення супольнасці. Сярод гуманітарных дысцыплін адносна ўстойлівае ўзнаўленне навуковых кадраў назіраецца толькі ў галіне гісторыі і філалогіі (каля 25 дысертацый за год у гісторыі). Сярод

сацыяльных навук параўнальна моцныя пазіцыі мае толькі эканоміка — каля 40 дысертацый за год.



Іл. 3. Колькасць апублікаваных дысертацый, 2012–2023 гады

Рэпрэсіі супраць нязгодных з дзейнасцю ўладаў

Нягледзячы на агульныя негатыўныя тэндэнцыі развіцця на працягу папярэдніх дзесяцігоддзяў, пасля 2020 года даследчы сектар зазнаў дадатковыя рэпрэсіі і чысткі. З дастатковай упэўненасцю можна сказаць, што рэпрэсіі закранулі сотні выкладчыкаў універсітэтаў і даследчых цэнтраў; яшчэ больш людзей страцілі магчымасць працягваць звыклую прафесійную дзейнасць. Каля 30 чалавек зазналі крымінальны пераслед.

Пагроза палітычна матываваных рэпрэсій вымусіла сотні даследчыкаў пакінуць Беларусь і перасяліцца ў іншыя краіны. Асноўнымі кірункамі міграцыі сталі Польшча, Літва і Германія.

Акрамя таго, у Беларусі быў практычна знішчаны сектар незалежных даследаванняў. З усталяваннем аўтарытарнага кіравання ў сярэдзіне 1990-х гадоў і пачаткам палітычных рэпрэсій і ціску на ўніверсітэты ў Беларусі пачаў фарміравацца сектар няўрадавых арганізацый і аналітычных цэнтраў (think tanks), якія займаліся незалежнымі ад дзяржавы даследаваннямі і аналітыкай. Сектар складаўся з некалькіх дзясяткаў арганізацый і прыцягваў да працы да сотні даследчыкаў на сталай або часовай аснове.

Увесь сектар быў разбураны. Большасць даследчыкаў і аналітыкаў былі вымушаныя выехаць з краіны, многія з іх зазналі завочны крымінальны пераслед (напрыклад, у межах справы аналітыкаў Ціханоўскай), а каля чатырох чалавек пазбавілі волі. Практычна ўсе арганізацыі былі ліквідаваны або вымушаны дзейнічаць за мяжой.

Індактрынацыя і ідэалагічны кантроль

Ідэалагічны і палітычны кантроль заўсёды быў важнай часткай акадэмічнага жыцця Беларусі з моманту ўсталявання аўтарытарнага рэжыму ў 1996 годзе. Пры гэтым пасля палітычнага крызісу 2020 года ён набыў яшчэ больш жорсткія формы.

Выступаючы ў лютым 2024 года, кіраўнік Беларусі А. Лукашэнка яшчэ раз падкрэсліў, што сфера адукацыі «не можа быць па-за палітыкай», а рэктары ўніверсітэтаў нясуць непасрэдную адказнасць за «нацыянальную бяспеку» і «захаванне суверэнітэту краіны». Таксама было адкрыта заяўлена, што кіраўніцтва ўніверсітэтаў адказвае за тое, каб сярод іх работнікаў не было «людзей, якія не падзяляюць нашы падыходы і нашу палітыку, дзяржаўную ідэалогію». Лукашэнка таксама перасцярог ад прыёму на працу спецыялістаў, якія ўдзельнічалі ў пратэстах пасля 2020 года. Пры гэтым адной з прычын пратэстаў называлася «адурманенасць» студэнтаў «заходнімі каштоўнасцямі». [1]

Акрамя ідэалагічнага кантролю, пастаянна абмяркоўваецца ўзмацненне адміністрацыйнага кантролю. У прыватнасці, прадухіленне «дэцэнтралізацыі кіраўнічай вертыкалі» (то бок захавання нават абмежаванай акадэмічнай аўтаноміі) было прадстаўлена ў жніўні 2023 года як недапушчальная рызыка для кіравання БДУ нароўні з ліквідацыяй заган у арганізацыі «ідэалагічнай і выхаваўчай працы». [2]

Умяшанне ў даследчую працу і абмежаванні ў гэтай сферы (асабліва ў галіне гісторыі, палітыкі і СМІ) разглядаюцца ўладамі як абавязак дзяржаўных органаў. У сакавіку 2025 года І. Сергеенка, старшыня Палаты прадстаўнікоў, які раней узначальваў Адміністрацыю прэзідэнта, адзначыў, што «спекуляцыі на гістарычнай праблематыцы нясуць рэальную пагрозу нацыянальнай бяспецы», і падкрэсліў важную ролю гістарычнай адукацыі і акадэмічнай супольнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта для «нацыянальнай бяспекі і ідэалагічнай стабільнасці» (21.03.2025). [3]

У выступленнях прадстаўнікоў кіраўніцтва Беларусі ў 2022–2023 гадах, у прыватнасці І. Сергеенкі, міністра замежных спраў С. Алейніка, старшыні Палаты прадстаўнікоў У. Андрэйчанкі і памочніка міністра абароны ў ідэалагічнай працы Л. Касінскага, падкрэслівалася неабходнасць абароны афіцыйнай гістарычнай палітыкі і супрацьдзеяння спробам перагляду гісторыі.

У верасні 2023 года тэма афіцыйнай гістарычнай палітыкі ўздымалася і намеснікам кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Ігарам Луцкім, які звязваў інтэрпрэтацыю мінуўшчыны з нацыянальнымі інтарэсамі і дзяржаўнай бяспекай.

Прадстаўнікі афіцыйнай гістарычнай навукі таксама зрабілі мноства заяў пра неабходнасць перагляду гісторыі Беларусі, найперш пра выцясненне з яе заходніх і «нацыяналістычных» канцэпцый і падыходаў. Паказальным прыкладам з'яўляюцца спробы адмаўляць таталітарную прыроду палітычнага ладу СССР як «варожую паліталагічную трактоўку». [4]

Акадэмічныя ўстановы актыўна ўдзельнічаюць ва ўзвялічванні палітычнай ролі А. Лукашэнкі. Прыкладам можа служыць прэзентацыя кнігі «Наш Президент», якая адбылася 20 сакавіка 2025 года ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з удзелам старшыні яе Прэзідыума Уладзіміра Гусакова. Аналагічным прыкладам з'яўляюцца палітычныя выставы, у прыватнасці выстава БелТА «Паралельныя светы», якая прадстаўляе «свет апазіцыі» як свет «разбурэння і дэградацыі» (05.02.2024). [5, 6]

Таксама Акадэмія навук пачала працу над выданнем новай шматтомнай «Гісторыі Беларусі», якая павінна прывесці афіцыйнае выкладанне гісторыі краіны ў адпаведнасць з ідэалогіяй, што сфарміравалася пасля 2020 і 2022 гадоў. У гэтым кантэксце нядаўна выдадзеная «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» ўжо ўяўляецца ідэалагічна недастаткова прымальнай (15.08.2024).

Да іншых праяў узмацнення ідэалагічнага кантролю належаць рэпрэсіі і чысткі сярод незалежных экскурсаводаў, закрыццё, абмежаванні дзейнасці або вымушаная міграцыя многіх незалежных выдавецтваў, а таксама ачышчэнне бібліятэк і кнігарняў ад «экстрэмісцкай літаратуры». У гэтую катэгорыю трапляе вельмі шырокае кола твораў, уключаючы асобныя творы класікаў беларускай літаратуры XIX стагоддзя. [7]

Гісторыя як сродак мілітарызацыі і стварэння вобраза ворага

Пасля 2020-га і асабліва пасля 2022 года асаблівае значэнне набывае выкарыстанне гісторыі для прасоўвання мілітарысцкіх наратываў і фарміравання вобраза ворага з палітычнай апазіцыі і суседніх дзяржаў. Усе палітычна нелаяльныя сілы атаясамліваюцца з «нацыстамі», «ворагамі дзяржавы» і агентамі заходняга ўплыву.

Выкарыстанне гісторыі і агрэсіўных гістарычных наратываў у прапагандзе стала штодзённай практыкай палітычнага жыцця. Напрыклад, у 2023–2024 гадах толькі пра гістарычную мінуўшчыну Польшчы А. Лукашэнка выказваўся не менш за 32 разы, гэта значыць у сярэднім каля 1,3 раза на месяц. Большасць выказванняў адсылала да падзей Другой сусветнай вайны, галоўным чынам да «няўдзячнасці» Польшчы і супрацоўніцтва з нацыстамі. Яшчэ каля траціны выказванняў датычылася прадстаўлення міжваеннай Польшчы як рэпрэсіўнай і нацыяналістычнай дзяржавы.

Вобраз Польшчы і палякаў у цэлым стаў крайне негатыўным, а з 2022 года была праведзена серыя акцый разбурэння «польскіх» месцаў памяці, звязаных з Арміяй Краёвай, памяццю пра сталінскія рэпрэсіі і паўстаннем супраць Расійскай імперыі 1863–1864 гадоў. [8, 9]

Для ўзмацнення пачуцця пагрозы і фарміравання вобраза ворага рэгулярна агучваюцца не падмацаваныя фактамі сцвярджэнні пра імкненне Польшчы анексаваць Заходнюю Беларусь. Яшчэ часцей у выступленнях А. Лукашэнкі і іншых афіцыйных асоб сустракаюцца абвінавачанні ў адрас Еўропы і заходніх краін у сімпатыях да нацызму. Напрыклад, 27 студзеня 2024 года Лукашэнка заявіў: «Гэта яны сёння ўшаноўваюць катаў у сваіх парламентах. Гэта яны пачалі вайну з магіламі і помнікамі ў Польшчы, Прыбалтыцы і Украіне». [10]

Сучасны Захад малюецца як новае ўвасабленне фашызму. Гэты вобраз выкарыстоўваўся ў выступленнях генеральнага пракурора А. Шведа і рэктара Акадэміі кіравання В. Даніловіча, якія звязвалі сучасную еўрапейскую палітыку са спадчынай нацызму і супрацьпастаўлялі яе савецкай памяці пра Другую сусветную вайну.

Вайна і ўзмацненне расійскіх гістарычных і палітычных наратываў


Удзел беларускіх уладаў на баку Расіі ў вайне супраць Украіны прывёў да значнага росту расійскага ўплыву ва ўсіх сферах — ад пытанняў бяспекі да эканомікі, інфармацыі, адукацыі і навукі. Шырока распаўсюдзіліся прарасійскія наратывы ў сферы гісторыі, культуры і палітыкі ідэнтычнасці. Усё гэта суправаджаецца новай хваляй рэпрэсій супраць навукоўцаў сацыяльных і гуманітарных дысцыплін, якія працуюць у дзяржаўных і незалежных установах і ствараюць незалежныя ад расійскіх наратываў і прадэмакратычныя веды пра сучасную Беларусь і яе гісторыю.

Асноўны акцэнт робіцца на ўзвялічванні ролі Расіі (Расійскай імперыі), паказе Захаду як гістарычна агрэсіўнай сілы, дыскрэдытацыі дэмакратыі і ўсхваленні аўтарытарнага кіравання.

Другая сусветная вайна пачынае разглядацца як адзін з эпізодаў супрацьстаяння Захаду. Станоўча ацэньваецца роля савецкай аўтарытарнай і таталітарнай сістэмы, у тым ліку палітыка «моцнай рукі» І. Сталіна. Пры гэтым рэпрэсіі замоўчваюцца.

Існуе мноства прыкладаў, якія паказваюць істотныя змены ў гэтай сферы. Ілюстрацыяй можа служыць даследаванне Інстытута «Палітычная сфера» 2025 года, прысвечанае рэпрэзентацыі ў дзяржаўных і недзяржаўных медыя вызваленчага паўстання супраць Расійскай імперыі ў Беларусі, Польшчы і Літве 1863–1864 гадоў. Вобраз паўстання стаў важнай часткай беларускай ідэнтычнасці. Прыведзеныя даныя паказваюць, наколькі наратывы пра паўстанне пасля 2020 года набылі прарасійскі характар. [11]

Пры гэтым многія тэмы і кірункі даследаванняў фактычна зніклі або апынуліся маргіналізаванымі.



Іл. 4. Сярэдняе значэнне наратыву па гадах і сектарах, 2010–2024

У галіне акадэмічных даследаванняў таксама назіраецца ўзмацненне ўзаемадзеяння з Расіяй і яе ўплыву. У афіцыйных заявах падкрэсліваецца неабходнасць супольнай абароны гістарычных інтэрпрэтацый і выпрацоўвання механізмаў супрацьдзеяння меркаванай фальсіфікацыі гісторыі. Да дадатковых ініцыятыў належаць фарміраванне адзінай з Расіяй навукова-тэхналагічнай прасторы (Шчоткіна), выпуск дапаможніка па гісторыі Саюзнай дзяржавы (фонд «Гістарычная памяць»), першае пасяджэнне Экспертна-кансультацыйнага расійска-беларускага савета па гісторыі (15.11.2023) і падпісанне мемарандума аб стварэнні Сумеснай расійска-беларускай камісіі па гісторыі (25.01.2024), правядзенне форумаў моладзі Саюзнай дзяржавы, якія пазначаюцца як «патрыятычныя» (19.03.2025). Таксама выказваюцца ідэі дамагацца міжнароднага прызнання «генацыду савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (намесніца старшыні камісіі Палаты прадстаўнікоў Лілія Ананіч, 14.12.2022). Паказальным сімвалічным жэстам стала прысваенне БДУ звання ганаровага прафесара міністру замежных спраў Расіі С. Лаўрову (01.07.2022). [12, 13, 14]

Робяцца таксама спробы развіваць адносіны з іншымі незаходнімі краінамі. Пры гэтым у выказваннях афіцыйных асоб нямала хвалебных ацэнак Кітая: ад заяў Лукашэнкі да выдання прац Сі Цзіньпіна на беларускай мове. Да гэтага можна дадаць адкрыццё ў БДУ даследчага цэнтра Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (27.10.2023) і такія менш звыклыя ініцыятывы, як

пашырэнне супрацоўніцтва з універсітэтамі Зімбабвэ. Аднак гэтыя спробы ніяк не зніжаюць залежнасці ад Расіі.

Кароткія высновы

На працягу практычна ўсяго перыяду незалежнасці акадэмічная сфера Беларусі развівалася ў складаных умовах, звязаных з абмежаванымі рэсурсамі, агульным заняпадам сектара (асабліва на працягу апошніх 15 гадоў), а таксама моцным ідэалагічным і адміністрацыйным кантролем. Пасля палітычнага крызісу 2020 года і пачатку вайны Расіі супраць Украіны ў 2022-м умовы для развіцця сталі яшчэ менш спрыяльнымі.

Палітычна матываваныя рэпрэсіі закранулі сотні даследчыкаў і выкладчыкаў. Многія з іх былі вымушаныя пакінуць краіну, яшчэ больш людзей страцілі магчымасць працягваць акадэмічную кар'еру, дзясяткі зазналі крымінальны пераслед.

Адначасова ўзмацніўся ідэалагічны і адміністрацыйны ціск на акадэмічную сферу. Кантроль над зместам сацыяльных і гуманітарных даследаванняў фактычна стаў абавязкам і паўсядзённай практыкай выканаўчых органаў. Гістарычныя, знешнепалітычныя і іншыя сацыяльна-гуманітарныя наратывы пачалі актыўна выкарыстоўвацца для апраўдання вайны і рэпрэсій, фарміравання вобраза ворага з суседніх народаў і беларускай палітычнай апазіцыі. Значна вырас уплыў расійскіх гістарычных і палітычных наратываў. Асновай новай ідэалогіі сталі антыеўрапейскія і антызаходнія наратывы. Пры гэтым многія тэмы і кірункі даследаванняў фактычна зніклі або зрабіліся маргіналізаванымі.

У гэтых умовах асаблівае значэнне набывае захаванне і развіццё беларускай акадэмічнай супольнасці, не звязанай з уладай, а таксама даследаванняў Беларусі, свабодных ад ідэалагічнага кантролю. ЕС можа адыграць у гэтым вырашальную ролю, стварыўшы магчымасці для развіцця дэмакратычнай і еўрапейскай ідэнтычнасці Беларусі і атрымання інфармацыі пра стан беларускага грамадства і палітыкі. Гэта можа спрыяць умацаванню бяспекі ўсходняй часткі ЕС. Для гэтага неабходная праца ў трох асноўных кірунках: падтрымка не звязаных з дзяржавай беларускіх даследаванняў, развіццё даследаванняў Беларусі і захаванне даследчай супольнасці.

Задачы і магчымасці для ЕС

Улічваючы вельмі неспрыяльныя ўмовы для развіцця даследаванняў у Беларусі, асабліва даследаванняў, свабодных ад ідэалагічнага кантролю ўладаў і расійскіх імперскіх наратываў, ЕС можа і павінен адыгрываць важную ролю ў гэтай сферы. Такая падтрымка адпавядае не толькі інтарэсам беларускага грамадства, але і стратэгічным інтарэсам ЕС: забеспячэнню бяспекі, зніжэнню расійскага ўплыву і павышэнню палітычнай устойлівасці ва Усходняй Еўропе.

Прагрэс магчымы ў трох асноўных кірунках: падтрымка даследчыкаў, якія зазналі рэпрэсіі; падтрымка праграм даследаванняў Беларусі ў сацыяльных і гуманітарных дысцыплінах; падтрымка ініцыятыў па камунікацыі і развіцці супольнасці (community building) даследчыкаў беларускага паходжання ў ЕС.

Падтрымка даследчыкаў

Важным механізмам дапамогі рэпрэсаваным даследчыкам і тым, хто страціў магчымасць займацца прафесійнай дзейнасцю ў Беларусі, з'яўляюцца кароткатэрміновыя стыпендыі на адзін-два гады. Пасля 2020 года ЕС і ўрады асобных дзяржаў-членаў аказалі дапамогу некалькім сотням рэпрэсаваных навукоўцаў, дзякуючы чаму многія змаглі застацца ў прафесіі і адаптавацца да эміграцыі. Такую дапамогу аказвалі Польшча, Літва, Германія, а таксама праграма SALT.

Прызнаючы маштаб ужо аказанай падтрымкі, варта адзначыць, што рэпрэсіі ў Беларусі працягваюцца, а магчымасцяў для развіцця навукі, не падкантрольнай аўтарытарнай уладзе, па-ранейшаму няма. Таму праграмы падтрымкі неабходна працягнуць. Колькасць выдзеленых стыпендый павінна адпавядаць рэальным патрэбам. Мяркуецца, што ў цяперашняй сітуацыі гаворка можа ісці прыкладна пра 15–25 стыпендый на год працягласцю 9–12 месяцаў. Аднак важнейшая за колькасць стыпендый рэгулярнасць іх давання.

Істотным недахопам дзейных механізмаў падтрымкі з'яўляецца іх «хвалевы» характар. У асобныя гады колькасць стыпендый можа быць вялікай, а ў наступныя гады яны могуць адсутнічаць увогуле. Важна выбудаваць сістэму падтрымкі на аснове штогадовага конкурсу з гарызонтам планавання на чатыры-пяць гадоў.

Падтрымка даследаванняў

Як адзначалася вышэй, у Беларусі практычна няма магчымасці развіваць сацыяльныя і гуманітарныя даследаванні, заснаваныя на навуковых прынцыпах і дэмакратычных каштоўнасцях. У асобных дысцыплінах прафесійны прагрэс магчымы: гэта археалогія, эканамічная гісторыя, многія аспекты гісторыі культуры, непалітычныя тэмы сацыялагічных даследаванняў і г. д. Аднак многія кірункі даследаванняў фактычна не могуць існаваць або вымушаны развівацца пад жорсткім ідэалагічным кантролем Мінска і Масквы: даследаванні Другой сусветнай вайны, бальшавіцкіх рэпрэсій, вызваленчых паўстанняў XIX стагоддзя, дэмакратычных інстытутаў Новага часу, нацыянальнага руху і спробаў стварэння незалежнай дзяржавы ў XX стагоддзі.

Тым больш пад поўным палітычным кантролем знаходзяцца даследаванні гісторыі з 1991 года, аналіз палітычных інстытутаў і замежнай палітыкі Беларусі, працэсаў постсавецкай інтэграцыі і грамадскай думкі ў краіне.

Як адзначалася вышэй, развіццё гэтых кірункаў важнае не толькі для фарміравання дэмакратычнай альтэрнатывы для беларускага грамадства. Развіццё гэтых даследаванняў важнае і для супрацьдзеяння прарасійскай прапагандзе. Гэтая інфармацыя таксама важная для ЕС, паколькі дазваляе лепш разумець працэсы ў Беларусі і павышаць узровень уласнай бяспекі.

У межах ЕС неабходна распрацаваць сістэмную праграму падтрымкі Belarusian Studies з грантамі на даследаванні, даступнымі як беларускім, так і еўрапейскім навукоўцам.

Цяпер адносна сістэматычныя даследаванні Беларусі праводзяцца толькі ў Польшчы. Пры гэтым часта іх тэматыка вызначаецца найперш польскай перспектывай: гісторыя Беларусі і яе рэгіёнаў у складзе міжваеннай Польшчы, гісторыя польскага руху ў Беларусі, аналіз міждзяржаўных адносін і г. д. Тым не менш у такія даследаванні ўцягнута да некалькіх дзясяткаў чалавек, штогод выходзіць да дзесяці артыкулаў і некалькі манаграфій. У іншых краінах, у тым ліку ў Германіі,

даследаваннямі Беларусі займаюцца адзінкавыя спецыялісты, а публікацыі выходзяць нерэгулярна і разрознена.

Праграма падтрымкі даследаванняў магла б дзейнічаць у межах SALT або ў форме мэтавага штогадовага конкурсу на базе адной з нацыянальных структур. Прапануецца штогод вылучаць 5–10 групавых даследчых грантаў працягласцю адзін-два гады пры фінансаванні з боку ЕС.

Падтрымка супольнасці

Істотным выклікам для захавання навуковага патэнцыялу Беларусі з'яўляецца распад нацыянальнай акадэмічнай супольнасці. Улады Беларусі фактычна праводзяць палітыку расколу, забараняючы кантакты паміж навукоўцамі, якія з'ехалі і засталіся, або робячы іх рызыкоўнымі, а таксама абмяжоўваючы ўзаемадзеянне супрацоўнікаў дзяржаўных устаноў з іншымі даследчыкамі.

У сваю чаргу, даследчыкі, якія пераехалі ў ЕС, знаходзяцца ў розных краінах, што прыводзіць да разрыву сувязяў і фактычнага распаду прафесійных супольнасцяў. Гэта негатыўна ўплывае на магчымасці стварэння ведаў пра Беларусь і абмену вынікамі. Таму важная падтрымка ініцыятыў па захаванні і развіцці супольнасці, у прыватнасці Міжнароднага кангрэса даследчыкаў Беларусі і іншых формаў прафесійнай камунікацыі. Асобны кірунак можна прадугледзець у межах праграмы SALT і аналагічных праектаў, уключаючы Science at Risk. Неабходна захаваць такую інфраструктуру. [15]

Крыніцы і заўвагі

1. Лукашенко о проблемах высшего образования и идеологическом контроле. Sputnik Беларусь, 13.02.2024. https://sputnik.by/20240213/lukashenko-oboznachil-glavnye-problemy-vysshego-obrazovaniya-v-belarusi-1083598581.html

2. Лукашенко о процессах в БГУ. Sputnik Беларусь, 25.08.2023. https://sputnik.by/20230825/lukashenko-nastorazhivayut-proiskhodyaschie-v-bgu-protsessy-1078843621.html

3. Сергеенко о «спекуляциях на истории». Sputnik Беларусь, 21.03.2025. https://sputnik.by/20250321/sergeenko-spekulyatsii-na-istorii-nesut-ugrozu-natsionalnoy-bezopasnosti-1094683458.html

4. «Белорусам чуждо искажение фактов». Историк о концепции тоталитаризма. БелТА, 2023. https://belta.by/society/view/belorusam-chuzhdo-iskazhenie-faktov-istorik-o-problematike-kontseptsii-totalitarizma-596263-2023/

5. «Книгу "Наш Президент" презентовали в НАН Беларуси». БелТА, 20.03.2025. https://belta.by/society/view/knigu-nash-prezident-prezentovali-v-nan-belarusi-703906-2025/

6. БелТА, материалы о выставке «Паралельныя светы», январь 2024 года (официальный Telegram-канал). https://t.me/s/belta_telegramm/232108

7. Беларускі ПЭН. Мониторинг нарушений культурных прав и прав человека в отношении деятелей культуры: Беларусь, 2023 год. 01.03.2024. https://penbelarus.org/2024/03/01/monitoring-narushenij-kulturnyh-prav-i-prav-cheloveka-v-otnoshenii-deyatelej-kultury-belarus-2023-god.html

8. МИД Польши. Заявление о разрушении захоронения солдат Армии Крайовой в Микулишках. 05.07.2022. https://www.gov.pl/web/slovenija/mfa-statement-on-demolition-of-polish-home-army-soldiers-burial-ground-in-mikulishki-belarus

9. Kłysiński K. Dewastacje polskich cmentarzy wojskowych na Białorusi. OSW, 11.07.2022. https://www.osw.waw.pl/en/node/30395

10. Российское историческое общество. Выступление А. Лукашенко при открытии мемориала, 27.01.2024. https://historyrussia.org/sobytiya/vladimir-putin-otkryl-memorial-v-pamyat-o-mirnykh-zhitelyakh-sovetskogo-soyuza-pogibshikh-v-khode-velikoj-otechestvennoj-vojny.html

11. Казакевіч А. Няскончанае паўстанне. Падзеі 1863–1864 гг. у наратывах беларускіх медыя 2010–2024 гадоў. Даклад на III польска-беларускім экспертным форуме імя Р. Скірмунта, 2025 (публічная спасылка на поўны тэкст не ўстаноўлена).

12. Состоялось первое заседание Экспертно-консультативного российско-белорусского совета по истории (15.11.2023). Сообщение ЭКС, 20.11.2023. https://ecs-hist.ru/news/event/4767/

13. Создана Совместная российско-белорусская комиссия по истории (меморандум подписан 25.01.2024). Сообщение ЭКС, 26.01.2024. https://ecs-hist.ru/news/event/4793/


14. «Лаврову присвоили звание почетного профессора БГУ». REFORM.news, 01.07.2022 (вторичное сообщение). https://reform.news/tag/bgu/

15. Science at Risk. Інфармацыя пра падтрымку беларускіх даследчыкаў. https://science-at-risk.org/belarus-get-help/

Інстытут палітычных даследаванняў «Палітычная сфера»
Беларуская навука пад ціскам
Трансфармацыя даследчага сектара Беларусі пасля 2020 года

www.palityka.org

ІНСТЫТУТ ПАЛІТЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ



ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА